# ПРАДМОВА

Ад прафесіянальных і асабістых якасцей кіраўніка шмат у чым залежыць працэс навучальнай, творчай, выхаваўчай работы ў калектыве. Кіраўнік самадзейнага аркестра павінен адпавядаць цэламу шэрагу патрабаванняў, абумоўленых спецыфікай яго прафесіі, аб чым падрабязна будзе сказана ніжэй. Таму кіраўніку трэба пастаянна павышаць свой прафесіянальны ўзровень, удасканальваць методыку работы з самадзейным аркестрам народных інструментаў.

Таму гэты зборнік метадычных артыкулаў падрыхтаваны выкладчыкамі кафедры аркестравага дырыжыравання Мінскага інстытута культуры ў дапамогу кіраўнікам аркестравых калектываў. У ім паслядоўна выкладзены практычны матэрыял, які абагульняе вопыт выкладчыкаў кафедры, што працуюць на працягу многіх гадоў у якасці кіраўнікоў вучэбных і самадзейных аркестравых калектываў. Але варта падкрэсліць, што ніякі дапаможнік не можа даць гатовага рэцэпту ў вырашэнні такога прынцыпова важнага пытання, як фарміраванне творчага напрамку аркестравага калектыву. Вызначыць правільны напрамак работы калектыву - значыць знайсці адзіны магістральны шлях, па якому можа і павінен развівацца той ці іншы аркестр народных інструментаў. Разам з тым кіраўніку аркестра трэба вывучаць і асвойваць таксама асаблівасці народнай творчасці канкрэтнай вескі, раёна, вобласці, што гістарычна бліжэй за ўсе адпавядаюць побыту насельніцтва.

З практыкі работы шматлікіх самадзейных аркестраў, ансамбляў народных інструментаў можна сказаць, што няма нейкіх непахісных канонаў, універсальных рэкамендацый, адзіных правілаў на ўсе выпадкі арганізацыі і работы самадзейных аркестравых калектываў. Пры ўсёй разнастайнасці форм і метадаў работы з самадзейным аркестрам, назіраюцца найбольш тыповыя, характэрныя асаблівасці функцыяніравання аркестравых калектываў. Напрыклад, адной з галоўных задач кіраўніка з'яўляецца канцэртна-выканаўчая дзейнасць. Акрамя традыцыйных відаў канцэртнай дзейнасці - справаздачныя канцэрты, удзелы ў аглядах, фестывалях і г.д., вялікае значэнне маюць канцэртныя выступленні ў падшэфных арганізацыях, у рабочых, маладзежных калектывах,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перад працаўнікамі вескі. Неабходна умацаванне творчых сувязей самадзейнага музычнага калектыву непасрэдна з вытворчай аўдыторыяй.

Тэндэнцыі, якія вызначыліся ў развіцці прафесіянальных і самадзейных аркестраў народных інструментаў, сведчаць аб тым, што пошукі будуць весціся па лініі прыцягнення новых тэмбравых фарбаў, папаўнення і абнаўлення некаторых груп і інструментаў.

Разам з гэтым неабходна таксама адзначыць некаторыя цяжкасці, якія сустракаюцца ў працэсе работы кіраўніка з калектывам, у прыватнасці тыя, што звязаны з матэрыяльнымі умовамі працы і быту спецыялістаў, складанасцю рэжыму іх дзейнасці, слабай навуковай арганізацыі працы, вялікай загружанасцю рознымі грамадскімі даручэннямі.

Але часцей за ўсе узнікаюць яны з-за недахопу вопыту ў большасці маладых кіраўнікоў. Адсюль няўменне выкарыстоўваць наўуныя тэарэтычныя і практычныя веды, атрыманыя ў навучальных установах культуры і мастацтва, арыентавацца ў абставінах стварэння новага калектыву і слабое ўяўленне аб сваіх магчымасцях у галіне арганізацыі і кіравання творчым калектывам.

Такім чынам, сення без звычкі да самастойнай працы спецыяліст можа і не адбыцца. Веды, набытыя ў навучальных установах, дадуць яму, вядома, магчымасць працаваць па спецыяльнасці, але не абнаўляючы і не удасканальваючы іх, сапраўдных поспехаў у рабоце ен не дасягне. Толькі чалавек, які выхаваў у сябе звычку да самастойнай працы, пастаянна будзе імкнуцца да папаўнення сваіх ведаў шляхам самаадукацыі.

Аўтары метадычнага зборніка ў дапамогу кіраўніку імкнуліся раскрыць не толькі асаблівасці асобных элементаў дырыжорскай практыкі ў самадзейным народным аркестры. У іх работах знайшлі свае асвятленне матэрыялы тэарэтычнага і практычнага характару з прымяненнем методыкі работы ў аркестравым калектыве і з улікам нацыянальных асаблівасцей музычнай культуры Беларусі.

Гэтыя праблемы умоўна можна падзяліць на тры групы. Першую групу складаюць праблемныя артыкулы па пытаннях фарміравання рэпертуару ў самадзейным аркестравым калектыве. Так, у артыкуле старшага выкладчыка Л.С.Тэ[illegible]равай асвя[illegible] спробы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аблягчэння аркестравай партытуры, г.зн. тут размова ідзе аб аблягчэнні, відазмяненні перакладу аркестравага матэрыялу з аднаго інструментальнага саставу на другі. У артыкуле дацэнта В.І.Шыракавай прапануюцца рэкамендацыі кіраўнікам самадзейнага аркестра народных інструментаў па падбору рэпертуару, а артыкул старшага выкладчыка Ф.М.Лысянкова прысвечаны пераламенню партытур для самадзейнага цымбальнага аркестра.

Другая група пытанняў звязана з работай над музычным творам. У рабоце ст. выкладчыка С.А.Анікеева выразна акрэслены тры этапы работы над музычным творам у аркестравым калектыве. У артыкуле ст. выкладчыка Трамбіцкай В.І. раскрываюцца асноўныя задачы і этапы работы дырыжора над партытурай аркестравага твора.

Трэцяя група пытанняў звязана з арганізацыяй аркестраў народных інструментаў, фальклорна-этнаграфічных ансамбляў і навучаннем ігры на народных інструментах.

У артыкуле выкладчыка Зубцова У.Ц. разглядаюцца праблемы фарміравання калектыву на першапачатковым этапе, колькасны састаў самадзейных і прафесійнальных аркестраў і ансамбляў. Актуальныя пытанні ужывання традыцый беларускай народнай інструментальнай музыкі ў педагагічным працэсе дзіцячага калектыва разглядаюцца ў артыкуле ст. выкладчыка Трамбіцкай В.І.

Артыкул дацэнтаВаласюк Л.К. вызначае новыя перспектыўныя напрамкі ў методыцы навучання ігры на інструментах домравай групы ва ўмовах работы самадзейнага аркестра.

Выказаныя выкладчыкамі кафедры прапановы і рэкамендацыі ўяўляюць толькі спробу намеціць некаторае пашырэнне дыяпазону прафесійнальных ведаў кіраўнікоў аркестравых калектываў і разам з тым павысіць узровень іх агульнай культуры ў галіне музычнага мастацтва. Гэты дапаможнік з'яўляецца пэўным практычным зачынам для далейшага вывучэння розных бакоў педагагічнай дзейнасці спецыялістаў народна-аркестравага жанру, дырыжораў-кіраўнікоў аркестраў і ансамбляў нашай рэспублікі.

Г.С.Мішуроў,
загадчык кафедры аркестравага дырыжыравання, кандыдат педагагічных навук, прафесар